# Правапіс асабовых канчаткаў дзеясловаў

## Як вызначыць спражэнне дзеяслова

**1 спосаб:** можна паставіць дзеяслоў у форму 3-й асобы множнага ліку. Калі дзеяслоў мае канчатак –уць, (–юць), то ён адносіцца да І спражэння (вядуць, чытаюць), канчатак –аць, (–яць) – да ІІ спражэння (гараць, сядзяць).

**2 спосаб:** па інфінітыве.

Да ІІ спражэння адносяцца:

- дзеясловы, якія ў інфінітыве заканчваюцца на –іць (-ыць), акрамя аднаскладовых дзеясловаў (піць, ліць) і ўтвораных ад іх (дапіць, наліць).
- дзеясловы *ненавідзець, цярпець, вярцець, спаць, залежаць, належаць, гнаць, стаяць, баяцца*.

Астатнія дзеясловы належаць да І спражэння.

У абвесным ладзе дзеясловы маюць наступныя асабовыя канчаткі:

| І спражэнне | |
|---|---|
| **адз. лік** | **мн. лік** |
| 1-я ас. -у, -ю | -ем, -ём, -ам, -ом |
| 2-я ас. -еш, -эш, -аш | -еце, -аце, -яце |
| 3-я ас. -е, -э, -а | -уць, -юць |

| ІІ спражэнне | |
|---|---|
| **адз. лік** | **мн. лік** |
| 1-я ас. -у, -ю | -ім, -ым |
| 2-я ас. -іш, -ыш | -іце, -ыце |
| 3-я ас. -іць, -ыць | -аць, -яць |

! Літары ы, і ёсць у канчатках толькі ІІ спражэння.

**1. Размяркуйце дзеясловы па тыпу спражэння:**

засцерагчы, сядзець, імкнуцца, страціць, падгледзець,
скласці, адабраць, пазнаёміцца, адысціся, перадаваць,
увайсці, панесці, зберагчы, выстаяць, папасці, плесці,
піць, узяць, пазнаёміцца, разводзіць.

У моўнай практыцы часта дапускаюцца памылкі пры ўжыванні дзеясловаў у 2-й ас. мн. л. Трэба памятаць, што ў 2-й асобе мн. л. націск не падае на першы склад канчатка. Ён падае або на аснову, або на 2-гі склад канчатка, напрыклад: ты гуля-еш - вы гуля-еце, ты няс-éш – вы нес-яцé (а не няс-éце ).

**2. Упішыце канчатак дзеяслова 2-ой асобы мн.ліку:**

| | |
|---|---|
| засцеражэш | засцераж |
| сядзіш | седз |
| імкнешся | імкн ся |
| страціш | страц |
| падгледзіш | падгледз |
| возьмеш | возьм |
| складзеш | складз |

LIVEWORKSHEETS

**3. Устаўце прапушчаныя літары:**

1. Прыйдз.. раніца – будз..м раіцца. 2. Ляж..ш не еўшы – устан..ш не спаўшы. 3. Не падмаж..ш – не паедз..ш. 4. Як пойдз..ш нацянькі, дык праходз..ш тры дзянькі. 5. Як дба..м, так і ма..м. 6. Ваўка ногі корм..ць. 7. Не памы..шся рукамі, дык памы..ць языкамі. 8. На яго дзе сядз..ш, там і злез..ш. 9. Начлег з сабой не нос..ць, а ў людзей прос..ць. 10. Кароўку не напо..ш, то і не падо..ш.

**4. Выканайце тэставае заданне**

А1. Адзначце дзеясловы, якія ў форме 1-й асобы мн. л. цяперашняга або будучага часу маюць канчатак –ым, (-ім):

1) стукаць;
2) лічыць;
3) узірацца;
4) выгрузіць;
5) рэзаць.

А2. Адзначце дзеясловы, якія ў форме 2-й асобы мн. л. цяперашняга часу маюць канчатак –аце (-яце):

1) казаць;
2) араць;
3) кахаць;
4) жаць;
5) плысці.

А3. Адзначце дзеясловы, якія ў форме 3-й асобы мн. л. цяперашняга або будучага часу маюць канчатак –аць (-яць):

1) марудзіць;
2) наліць;
3) пацвердзіць;
4) падоўжыць;
5) абысці.

LIVEWORKSHEETS